Вольга Какшынская



Галоўны бібліятэкар
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі

# АБ ВЫНІКАХ XXIII РЭСПУБЛІКАНСКАГА КОНКУРСУ «БІБЛІЯТЭКА – АСЯРОДАК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ»

XXIII Рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» завершаны, вынікі падзведзены і могуць разглядацца бібліятэкамі як імпульс для новых задумак і планаў.

Сёння конкурс – гэта не толькі дэманстрацыя некаторых дасягненняў, але і абмен вопытам, самаадзнака сваёй работы, адкрыццё для сябе новых гарызонтаў. Бібліятэкам краіны была прадстаўлена магчымасць паказаць свае лепшыя перспектыўныя напрацоўкі, арыгінальныя ідэі, прадэманстраваць моцныя бакі сваёй дзейнасці, спецыфіку работы з рознай чытацкай аўдыторыяй, асаблівасць рэгіянальнага аспекту.

Выявіць наватарскія думкі, новыя падыходы, інавацыйныя формы і метады работы – гэта галоўная задача кампетэнтнага журы. 12 мая 2015 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося пасяджэнне журы па падвядзенні вынікаў конкурсу, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, абласных выканаўчых камітэтаў, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаваных сістэм публічных і дзіцячых бібліятэк Мінска, грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры».

У рэспубліканскім этапе конкурсу прынялі ўдзел 42 бібліятэкі: 12 цэнтральных бібліятэк, 30 бібліятэк-філіялаў, у тым ліку 19 гарпасялковых і сельскіх, 8 дзіцячых.

Увогуле колькасць дасланых работ, у параўнанні з мінулым годам, павялічылася. Кампетэнтнае журы адзначыла разнастайнасць увасобленых ідэй і творчы падыход удзельнікаў конкурсу, высокую інфарматыўнасць і якасць афармлення прадстаўленых матэрыялаў, сістэматызацыю дадаткаў і культуру падачы. Звярнула на сябе ўвагу колькаснае павелічэнне і змястоўнасць матэрыялаў, прадстаўленых у намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы». Найбольш яскрава прадэманстравалі свой інавацыйны вопыт работы Магілёўская і Брэсцкая вобласці.

Усяго па выніках конкурсу дыпломамі першай, другой і трэцяй ступеняў былі адзначаны 23 бібліятэкі. 10 работ было вызначана журы на заахвочвальныя прэміі, каб такім чынам, нягледзячы на нязначныя недапрацоўкі, адзначыць руплівую працу іх аўтараў. Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны ў адпаведнасці з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 79 ад 29 чэрвеня 2015 г. «Аб выніках XXIII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».

Паведамім больш падрабязна пра дасягнені бібліятэк-пераможцаў у конкурсе, за якія яны атрымалі ў кожнай з намінацый дыпломы першай, другой і трэцяй ступеняў.

**У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»** дыпломам першай ступені ўзнагароджана *Дзіцячая бібліятэка ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Шклоўскага раёна» Магілёўскай вобласці.* Павысіць статус кнігі, прыцягнуць да чытання і карыстаня бібліятэкай дзяцей і падлеткаў, павысіць іх інтэлектуальны ўзровень і развіць чытацкі густ бібліятэцы дапамагае работа па мэтавай праграме «Мы разам з кнігай спазнаём свет». Праграма арганічна спалучаецца з тэматычнымі праектамі: «Дом кніжак – для малышоў і малышак», «З тэатрам лялек – у свет кнігі», «Мы на гэтай зямлі нарадзіліся», «Казкі Лысай Гары», «12 імгненняў вайны», «Канікулы ў бібліятэцы».

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі стала *Елкаўская сельская бібліятэка ДУК «Зэльвенская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці.* Любоў да роднай зямлі, пачуццё далучэння да лёсу бацькаўшчыны, гонар за гісторыю і культуру свайго краю – усё гэта выхоўвае ў дзяцей і падлеткаў бібліятэкар Елкаўскай сельскай бібліятэкі. У рамках краязнаўчага праекта «Памяць аб мінулым і сучасным для будучыні» створана электронная папка са звесткамі аб адметнасцях Сынкавіцкага краю – своеасаблівы «банк» краязнаўчай інфармацыі бібліятэкі: помнікі прыроды, помнікі-абеліскі, інфармацыя аб мясцовых паэтах і іх творчасці, мясцовыя майстры, фермерская гаспадарка «Верас» і інш.

Дыпломам другой ступені ў гэтай намінацыі прызначана *Дзіцячая бібліятэка-філіял № 6 Светлагорскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай*

*сістэмы Гомельскай вобласці.* Бібліятэка адыгрывае значную ролю ў культурным жыцці Светлагорска – выступае як цэнтр кнігі і чытання, інфармацыйнай падтрымкі адукацыі, асветніцтва, патрыятычнага і духоўнага выхавання падрастаючага пакалення. За апошнія пяць гадоў у бібліятэцы распрацавана і рэалізуецца пяць праектаў: «Духовное начало», «Расцём здаровымі», «Тэрыторыя непасед», «Прафесійны арыенцір», «Чытай, мікраэн!», што садзейнічае развіццю бібліятэкі, прыцягвае новых карыстальнікаў і партнёраў, дапамагае падтрымліваць высокі аўтарытэт у мясцовым асяроддзі.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, дыпломам другой ступені адзначана *Астрынская гарпасялковая бібліятэка Шчучынскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Гродзенскай вобласці.* Бібліятэкай вядзецца шматгранная дзейнасць па краязнаўству. Вынікам сумеснай работы бібліятэкара і членаў клуба «Спадчына» стала гістарычная праца – летапісы пасёлка Астрына: «Астрына: ўчора, сёння, заўтра» і «Астрына: гісторыя, сучаснасць, перспектывы». Сабраны, захаваны і сістэматызаваны краязнаўчы матэрыял дае ўяўленне аб пасёлку, можа выкарыстоўвацца ў якасці навукова-пазнавальнай літаратуры.

Дыплом трэцяй ступені ў намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем» прысуджаны *Дзіцячай бібліятэцы імя С. Маршака ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка» Віцебскай вобласці.* Шматгранная дзейнасць бібліятэкі па далучэнні падрастаючага пакалення да кнігі і чытання скіравана на інавацыйныя формы работы – стварэнне буктрэйлераў, работу летняй кіназалы і лялечнага тэатра «Теремок», правядзенне віртуальных аглядаў кніжных навінак і флэшмобаў. У бібліятэцы распрацаваны праграмы па арганізацыі з асобнымі групамі чытачоў «Дорога добра» і чытацкага развіцця дашкольнікаў «Книжный сад», праект «Волшебный рюкзачок» і акцыя «Скоро в школу» для дашкольнікаў і іх бацькоў.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк трэцяй прэміяй адзначана *Ходасаўская сельская бібліятэка ДУК «Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна» Магілёўскай вобласці.* Далучэнне падрастаючага пакалення да пазнання роднага краю, патрыятычнае выхаванне моладзі з'яўляюцца асноўнымі напрамкамі работы бібліятэкі. Бібліятэка плённа працуе па краязнаўчай праграме «Памяць Мсціслаўшчыны», што дае магчымасць узмацніць яе ролю як краязнаўча-патрыятычнага цэнтра, павысіць узровень эколага-краязнаўчай культуры дзяцей і падлеткаў. Для самых дапытлівых, зацейлівых дзяцей пры бібліятэцы дзейнічаюць лялечны гуртох «Пятрушка», аматарскае аб'яднанне «Ачумелыя ручкі», клуб «Падлетак».

**У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу»** дыплом першай ступені атрымала *Дзяржынская цэнтральная раённая бібліятэка Мінскай вобласці.* На якасна новы ўзровень узнята работа бібліятэкі па патрыятычным выхаванні моладзі. Бібліятэка паспяхова рэалізуе праект «Ішоў мой край дарогамі вайны», накіраванага на выхаванне ў моладзі пачуцця патрыятызму і любові да сваёй Радзімы, працяг героіка-патрыятычных традыцый, забеспячэнне іх пераемнасці. Праект прадугледжвае цыкл мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю лепшых твораў аб вайне; фарміраванне баз даных аб Героях Савецкага Саюза, удзельніках Вялікай Айчыннай вайны, падзеях, якія адбываліся на тэрыторыі Дзяржыншчыны; сістэматызацыю ўспамінаў удзельнікаў вайны, дзяцей вайны.

На першае месца ў гэтай намінацыі вылучана *Астрамечаўская сельская бібліятэка-філіял імя Ф. Паўленкава Брэсцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.* Бібліятэка ўносіць важкі ўклад у падрыхтоўку свята 500-годдзя вёскі Астрамечава, якое адбудзецца ў 2016 г. Супрацоўнікамі бібліятэкі вядзецца актыўная пошукавая работа па зборы інфармацыі аб вёсцы Астрамечава, вынікам якой сталі бібліяграфічны агляд «Па хвалях часу: памяць аб мінулым захоўвае бібліятэка» і электронныя прэзентацыі. Гэтыя матэрыялы адлюстроўваюць гісторыю края з далёкай мінуўшчыны і па сённяшні дзень, знаёмяць з выдатнымі людзьмі, ветэранамі вёскі; праводзяць віртуальную экскурсію па вуліцах Астрамечава.

Дыпломам другой ступені ў намінацыі «За пошукавую і даследчую працу» адзначана *Іўеўская раённая дзіцячая бібліятэка ДУК «Іўеўская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці.* Супрацоўнікамі дзіцячай бібліятэкі праведзена вялікая даследчая работа па падрыхтоўцы інфармацыйна-тэматычнага зборніка, выдадзенага да 70-годдзя вызвалення Іўеўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Нам жыць і помніць», адзін з раздзелаў якога прысвечаны Іўеўскаму сіроцкаму дзіцячаму дому. У выніку пошукавай і даследчай працы сабраны багацейшы фотадакументальны матэрыял аб Іўеўскім сіроцкім дзіцячым доме, аб лёсах яго выхаванцаў, педагогаў і выхавацеляў, абслугоўваючым персанале, што раскрывае нязведанную старонку ў гісторыі Іўеўшчыны.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у азначанай намінацыі другое месца заняла *Гадзілавіцкая сельская бібліятэка ДУК «Рагачоўская цэнтральная раённая бібліятэка» Гомельскай вобласці.* Дамінуючым напрамкам у рабоце бібліятэкі выступае патрыятычнае краязнаўства. Штогод бібліятэкар рыхтуе і праводзіць мерапрыемствы, прысвечаныя гадавіне вызвалення Гадзілавіч ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Пастаяннымі ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў з'яўляюцца малалетнія вязні Азарычскага канцлагера, дзеці вайны, прадстаўнікі раённых арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, ідэалагічныя работнікі. Каб больш пазнаць, знайсці цікавы матэрыял і экспанаты бібліятэкар цесна супрацоўнічае з музеямі, архівамі, сродкамі масавай інфармацыі.

Дыпломам трэцяй ступені ў намінацыі «За пошукавую і даследчую працу» ўзнагароджана *Кіраўская цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Сетка бібліятэк Кіраўскага раёна» Магілёўскай вобласці.* Выкарыстоўваючы традыцыйныя і інавацыйныя формы работы, бібліятэка выступае ў ролі захавальніцы рэгіянальных і культурна-этнаграфічных традыцый. Бібліятэкары знаёмяць карыстальнікаў з багатай гісторыяй і народнай культурай Кіраўшчыны, яе выдатнымі ўраджэнцамі, развіваюць цікавасць да самабытных традыцый землякоў, беражлівае стаўленне да мінулага. Некалькі год запар бібліятэкай арганізоўваліся краязнаўчыя пошукавыя экспедыцыі «Вучы народ, вучыся ў народа» па

вёсках Кіраўшчыны, у выніку чаго створана база даных «Схема-карта Кіраўскага раёна», а таксама выдадзены зборнік «Легенды Кіраўскага краю».

Трэцяе месца ў гэтай намінацыі заняла *Обальская гарпасялковая бібліятэка ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці.* Бібліятэка мае даўнія традыцыі краязнаўчай работы, асобным накірункам якой абрана напісанне бібліятэчнай гісторыі. Супрацоўнікі бібліятэкі звязалі гісторыю роднай мясцовасці з бібліятэчнай гісторыяй і прадставілі на конкурс гісторыка-краязнаўчы экскурс «История Обольской горпоселковой библиотеки в истории Обольского края». Сабраныя дакументальныя матэрыялы адлюстроўваюць бібліятэчнае жыццё ў суадносінах з грамадскімі і культурнымі падзеямі па гадах і перыядах.

**У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»** лепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк адзначана *Цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага УК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Бабруйска» Магілёўскай вобласці.* Адзін з галоўных інавацыйных праектаў бібліятэкі – «бібліятэчная кінаіндустрыя», якая прадугледжвае стварэнне і шырокае выкарыстанне відэадакументаў уласнай генерацыі, як найбольш эфектыўнага і даступнага сродка для прасоўвання чытання і бібліятэкі. Прэзентацыйныя фільмы, фільмы-рэпартажы, фільмы-падзеі розных жанраў – свайго роду аповед аб дзейнасці бібліятэк УК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Бабруйска», яе паслугах, гісторыі развіцця і планах на будучыню.

Вылучылася навацыямі ў галіне бібліятэчнай справы і заняла першае месца *Лукаўская сельская бібліятэка-філіял Маларыцкай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Брэсцкай вобласці.* Укараненне інавацыйных тэхналогій і форм абслугоўвання карыстальнікаў – слайд-аглядаў, прэзентацый дыскаў, віртуальных экскурсій, слайд-падарожжаў і іншых характэрна дзя дзейнасці гэтай бібліятэкі. Вынікам карпатлівай краязнаўчай пошукавай працы бібліятэкі стала стварэнне летапісу вёскі Лукава, а таксама паўнатэкставай краязнаўчай базы даных «Лукава».

Дыпломам другой ступені ў намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы» ўзнагароджана *Баранавіцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя В. Таўлая Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г. Баранавічы Брэсцкай вобласці.* З мэтай папулярызацыі ведаў па гісторыі роднага краю бібліятэкай распрацаваны і рэалізуецца краязнаўчы асветніцкі праект «Невядомыя старонкі правінцыяльнай гісторыі. Першая сусветная вайна ў Баранавіцкім краі». Сур'ёзную базу для распаўсюджвання краязнаўчых ведаў прадстаўляе створаная і інтэграваная ў сусветную інфармацыйную прастору ўласная гісторыка-краязнаўчая паўнатэкставая база даных «Баранавіцкі край у гады Першай сусветнай вайны».

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, адзначана *Баркалабаўская сельская бібліятэка Быхаўскай бібліятэчнай сеткі Магілёўскай вобласці.* Асноўнымі інавацыйнымі кірункамі бібліятэкі з'яўляецца распрацоўка і рэалізацыя бібліятэчных праграм: па духоўна-маральнай асвеце насельніцтва «Праваслаўныя традыцыі краю» і краязнаўчага характару «Баркалабаўскі край: чым болей пазнаю, тым болей зберагаю». З мэтай забеспячэння даступнасці да краязнаўчых рэсурсаў бібліятэкі створана паўнатэкставая электронная база даных «Баркалабава: гісторыя далёкая і блізкая», якая змяшчае вычэрпную інфармацыю аб гістарычным шляху і сучасным становішчы Баркалабаўшчыны.

Дыплом трэцяй ступені ў намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы» атрымала *Лёзненская цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці.* Работнікі бібліятэкі на працягу многіх гадоў збіралі матэрыял пра знакамітых пісьменнікаў – ураджэнцаў Лёзненшчыны і пра самадзейных аўтараў. Каб аб'яднаць усю інфармацыю аб літаратурным жыцці раёна ў адно цэлае бібліятэка распрацавала праект «Літаратурная карта Лёзненшчыны». У рамках праекта створана электронная паўнатэкставая база даных «Лёзненшчына літаратурная», у якой прадстаўлена каля 300 паўнатэкставых твораў пісьменнікаў і паэтаў Лёзненскага раёна, публікацый пра іх.

На трэцюю прэмію сярод гаргарпасялковых і сельскіх бібліятэк у намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы» журы не вылучыла пераможцу па прычыне неадпаведнасці матэрыялаў бібліятэк крытэрыям конкурсу.

**У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання»** першае месца прысуджана *Дзіцячай бібліятэцы-філіялу імя А.С. Пушкіна УК «Цэнтралізаваная сістэма гарадскіх публічных бібліятэк г. Магілёва».* Годным вынікам карпатлівай шматгадовай працы стала доўгатэрміновая праграма «Магілёвазнаўства», у рамках якой створаны і пастаянна папаўняюцца шэсць электронных баз даных і папакдасье па краязнаўстве. Значным рэалізаваным маштабным праектам стаў Вялікі бібліятэчны праект «12 сімвалаў года» –дванаццаць напрамкаў работы бібліятэкі. Своеасаблівым дасягненнем краязнаўчай работы бібліятэкі з'яўляецца выдадзеная серыя кніг для дзяцей, прысвечаная Магілёву «Я ў гэтым горадзе жыву, я гэты горад ведаю».

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк на першую прэмію журы прадставіла *Сельскую бібліятэку № 8 в. Вялікая Ухалода ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева» Мінскай вобласці.* Для дзейнасці гэтай бібліятэкі характэрна аб'яднанне традыцыйнага кніжнага ўтрымання бібліятэчнай дзейнасці і высокай ступені валодання сучаснымі праграмнымі сродкамі, тэлекамунікацыйнымі тэхналогіямі. Так, створаны бібліятэкай блог-сайт «Сельская бібліятэка вёскі Вялікая Ухалода» накіраваны на рэалізацыю праектнай дзейнасці, сувязь з чытачамі і падпісчыкамі. Для прыцягнення чытацкай увагі, фарміравання ўстойлівай цікавасці дзяцей да чытання бібліятэка плённа працуе па праекту «Инсайт Библиотечный», стварае буктрэйлеры – невялікія відэаролікі па матывах прачытанай кнігі.

Дыпломам другой ступені ў намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання» журы адзначыла *Дзіцячую бібліятэку № 1 ДУ «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска».* Бібліятэка на працягу некалькіх гадоў здзяйсняе шэраг праграм і праектаў, сярод якіх: праграмы «Зямля даўняя, зям-

ля слаўная» (па прапагандзе беларускай гісторыі, культуры, літаратуры і мастацтва), «Здароўе ў маіх руках» (па фарміраванні ў дзяцей ведаў аб здаровым ладзе жыцця, прафілактыцы шкодных звычак), «Эстэт і Ка» (па выхаванні эстэтычнага густу), «Акадэмія прававой культуры» (па прапагандзе правоў і абавязкаў сярод дзяцей і падлеткаў); сёрфінг-праект «Будь в тренде» (па сацыялізацыі падлеткаў, іх творчым развіцці, падтрыманні цікавасці да кнігі і чытання), віншавальна-кніжны праект «Дзень нараджэння з кнігай» (шляхам падбору пэўнай літаратуры дапамога дзецям і іх бацькам у пабудове плана падрыхтоўкі дня нараджэння).

Сярод бібліятэк, якія знаходзяцца ў сельскай мясцовасці, на другое месца ў гэтай намінацыі вылучана *Звянчацкая сельская бібліятэка ДУК «Клімавіцкая бібліятэчная сетка» Магілёўскай вобласці.* Сямейнае выхаванне, краязнаўства, захаванне народных святаў і абрадаў, папулярызацыя кнігі і чытання сярод дзяцей – прыярытэтныя напрамкі ў рабоце бібліятэкі. Бібліятэка распрацавала і з поспехам рэалізуе праграму «Моя семья – моя духовность», накіраваную на фарміраванне маральных каштоўнасцей сям'і праз духоўную асвету. Вынікам рэалізацыі мэтавай праграмы стала стварэнне Цэнтра духоўнай асветы «Мир дому твоему».

Дыплом трэцяй ступені ў намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання» заняла *Белаазёрская гарадская бібліятэка імя Н. Мацяш ДУК «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці.* Гарадская кніжніца Белаазёрска праводзіць велізарную работу па ўшанаванні памяці і раскрыцці літаратурна-мастацкай спадчыны Ніны Мацяш – выдатнай зямлячкі, прызнанага майстра на літаратурнай арэне. Сапраўдным сацыяльна-культурным брэндам берасцейскага краю сталі паэтычныя чытанні «Бабіна лета ў Белаазёрску», якія адбываюцца штогод у дзень нараджэння Ніны Мацяш.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк трэцюю прэмію атрымала *Дварэцкая сельская бібліятэка ДУК «Дзятлаўская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці.* З мэтай прыцягнення новых чытачоў, падтрымання цікавасці да кнігі і чытання бібліятэка праводзіць розныя бібліятэчныя акцыі. Напрыклад, штогадовая акцыя «Кніга 103», бібліятэка пад адкрытым небам «Лета з кнігай на палянцы», рэкламная акцыя «Дзень добры, будучы чытач!» і інш. Значная работа ажыццяўляецца бібліятэкай у рамках рэалізацыі раённай праграмы «На шляху да духоўнасці». Карысна і цікава арганізаваць вольны час дапамагае створанае пры бібліятэцы аматарскае аб'яднанне «Калейдаскоп».

Конкурс паказаў, што бібліятэкі Беларусі валодаюць невычэрпным патэнцыялам работы па фарміраванні нацыянальнай свядомасці насельніцтва, распаўсюджванні ідэі беларускасці, прапагандзе нацыянальнай спадчыны, гісторыі, літаратуры, мовы, народнай культуры, падтрымцы і развіцці чытання.



Summary

On the results of the XXIII Republican contest «Library - the center of national culture.» All winners are listed on nominations.